Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»*

13 чэрвеня 2013 года, № 10 (2092)



*5 чэрвеня, 00.02. «Прывітанне! Мы вас чуем» – ёсць кантакт з МКС*





ПАДЗЕЯ

# НАЧНЫ СЕАНС СУВЯЗІ З МКС

У ноч з 4 на 5 чэрвеня адбылася ўнікальная для Беларусі падзея. **Упершыню ў нашай краіне прайшоў прамы сеанс радыёсувязі з расійскімі членамі экіпажа Міжнароднай касмічнай станцыі.** Пагутарыць з касманаўтамі Паўлам Вінаградавым, Фёдарам Юрчыхіным і Аляксандрам Місуркіным пашчасціла беларускім і расійскім навукоўцам, а таксама студэнтам БДУ.







## У ЧАКАННІ СІГНАЛУ

Прыкладна за гадзіну да вылічанага кантакту з МКС на 13 паверсе ФМА сабраліся рэктар БДУ акадэмік *Сяргей Абламейка* разам з прарэктарамі, загадчык кафедры фізікі і аэракасмічных тэхналогій навуковы кіраўнік цэнтра аэракасмічнай адукацыі БДУ *Уладзімір Саечнікаў*, загадчык аддзела аэракасмічных даследаванняў НДІ ПФП БДУ лаўрэат дзяржпрэміі СССР *Барыс Бяляеў* і студэнты факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій, а таксама дэлегацыя Паўднёва-Заходняга дзяржаўнага ўніверсітэта (г. Курск, РФ) на чале з рэктарам прафесарам *Сяргеем Емяльянавым*, якая спецыяльна да гэтай падзеі прыбыла ў БДУ. Знамянальна, што ў ёй прысутнічаў прэзідэнт фонду Канстанціна Цыялкоўскага, праўнук гэтага выдатнага навукоўца, член Расійскай акадэміі касманаўтыкі *Сяргей Самбураў*. Удзельнікам чаканага касмічнага дыялогу быў прадэманстраваны фільм пра праграму Міжнароднай касмічнай станцыі і жыццё касманаўтаў на МКС.

## 11 ХВІЛІН У ЗОНЕ ЧУТНАСЦІ

У Мінску час набліжаецца да поўначы, а да месца сеанса працягваюць збірацца выкладчыкі, навукоўцы, журналісты і студэнты. Не дзіва, што мерапрыемства праходзіла ў такі позні час, бо Міжнародная касмічная станцыя жыве па сваім касмічным раскладзе, а дакладней па Грынвічы. Па графіку членаў экіпажа МКС – вольны час, які яны звычайна выкарыстоўваюць для зносін з Зямлёй. За суткі станцыя робіць 16 віткоў па арбіце. Дзе, як не ў космасе, усяго за 24 гадзіны можна сустрэць 16 узыходаў і захадаў сонца?

Загадзя было вядома, што ў зоне чутнасці Мінска Міжнародная касмічная станцыя будзе знаходзіцца ўсяго 11 хвілін. Каб не губляць каштоўны час, студэнты БДУ (якія, дарэчы, прымалі ўдзел у стварэнні ўніверсітэцкага нанаспадарожніка) выстройваюцца ў чаргу, каб задаць падрыхтаваныя пытанні расійскім касманаўтам.

Хвілінная гатоўнасць. Пайшоў адлік. Прыём... Сувязь з МКС усталявана ў 00.02. І доўгачаканыя словы членаў экіпажа: «Прывітанне! Мы вас чуем».

## ЖЫЦЦЁ Ў КОСМАСЕ – ГЭТА НОВАЕ НАРАДЖЭННЕ

Пачаў размову з расійскімі касманаўтамі рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка: «Добры дзень, калегі! Мы ўдзячныя вам, што вы знайшлі некалькі хвілін для зносін з намі. Гэта вялікі гонар для Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».

За час размовы студэнты паспелі задаць каля дзесяці рознабаковых пытанняў, звязаных са складанай тэхнікай, паўсядзённым жыццём на борце, выхадамі ў адкрыты космас і нават знешнім выглядам касманаўтаў. Па словах членаў экіпажа, пражыць у касмічных умовах без адмысловай фізічнай падрыхтоўкі немагчыма. Перадпалётныя курсы доўжацца ад 1,5 да 2 гадоў і залежаць ад кваліфікацыі касманаўта. На сувязь з роднымі і блізкімі касманаўты могуць выходзіць кожны дзень – існуюць адмысловыя сеансы сувязі для прыватных размоў.

– Нават у дзяцінстве я не задаваў так шмат пытанняў «Як? Што? Чаму?», як за два тыдні знаходжання на борце станцыі. Я зноўку вучыўся хадзіць і выконваць паўсядзённыя справы, – падзяліўся ўражаннямі самы малады член экіпажа Аляксандр Місуркін, якога ў жніўні чакае першы выхад у адкрыты космас.

Экіпаж 36/37-й экспедыцыі ў складзе Фёдара Юрчыхіна, Лукі Пармітана і астранаўта NASA Карэн Найберг прыстыкаваўся да станцыі 29 мая на касмічным караблі «Саюз ТМА-07М». Касманаўтаў, якія прыбылі на МКС, сустракалі спецыялісты экспедыцыі 35/36, якія ўжо працуюць на станцыі: камандзір Павел Вінаградаў, бортінжынер Аляксандр Місуркін і Крыстафер Кэсідзі.

Сеанс, як і было запланавана, доўжыўся 11 хвілін. У 00.13 па беларускім часе МКС выйшла з зоны чутнасці, і сувязь з членамі экіпажа была перапыненая. Напрыканцы рэктар БДУ Сяргей Абламейка выказаў словы падзякі касманаўтам, а таксама запрасіў іх у Мінск. На пытанні, якія студэнты не паспелі задаць экіпажу МКС, адказалі калегі з Курскага ўніверсітэта.

**(Заканчэнне на стар. 3)**

# Матэматык, настаўнік фізікаў

## Да 75-годдзя А. А. ЧУПРЫГІНА, дацэнта кафедры вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі фізічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта

Алег Аляксандравіч ЧУПРЫГІН вядомы ў Беларусі вучоны матэматык-метадыст. Па яго кнігах вучацца будучыя фізікі, матэматыкі, інжынеры. Ім апублікавана больш за паўсотні навуковых і навукова-метадычных прац. Навучальныя дапаможнікі, напісаныя Алегам Аляксандравічам, карыстаюцца попытам у студэнтаў многіх ВНУ. Распрацаваная з удзелам Алега Аляксандравіча Чупрыгіна вучэбная праграма па курсе «Матэматычны аналіз» для спецыяльнасці «Фізіка» зацверджана Міністэрствам адукацыі Беларусі ў якасці тыпавой. Ён прыроджаны педагог-даследчык, адданы справе, якой служыць.

Пяцьдзясят гадоў Алег Аляксандравіч выкладае матэматычныя дысцыпліны фізікам галоўнай ВНУ Беларусі. Пяцьдзясят набораў першакурснікаў фізічнага факультэта прайшлі вывучку Алега Чупрыгіна. Многія з іх сталі буйнымі навукоўцамі і выкладчыкамі ВНУ. Калі заходзіць гаворка пра фізфак, то часта выпускнікі Алега Аляксандравіча ўспамінаюць як захопленага педагога, які ўмее ненадакучліва перадаць студэнтам не толькі змест дысцыплін, але і разуменне іх важнасці для фізіка як прыродазнаўца. Строгая логіка, дакладнасць фармулёвак, тонкі гумар ператвараюць яго лекцыі ў прыгожыя канструкцыі – залатыя ключыкі, з дапамогай якіх пазнаецца фізіка і навакольны свет. Яго лекцыі не прапускаюць, іх запісваюць і потым абмяркоўваюць.

Алег Аляксандравіч Чупрыгін нарадзіўся 7 чэрвеня 1938 г. у в. Праскурні Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці другім дзіцём у сям'і. Брат Горальд на паўтара года старэйшы за яго. Бацька Аляксандр Львовіч пасля заканчэння Гомельскага педінстытута выкладаў матэматыку ў мясцовай школе, маці Ганна Міхайлаўна працавала настаўніцай малодшых класаў.

Алег Аляксандравіч Чупрыгін належыць да апаленага вайной пакалення. Дзяцінства і юнацтва Алега Чупрыгіна выпалі на цяжкія ваенныя і пасляваенныя гады. Калі пачалася вайна, Алегу было 3 гады, а калі вызвалілі Гомельшчыну, – каля 6. Бацька адразу пайшоў на фронт, маці засталася адна з малалеткамі. Таму да працы Алег прывучаны з самых малых гадоў, да аптымізму і справядлівасці таксама.

Яшчэ дашкольнікам па вясне збіраў у полі шчаўе і крапіву, каб маці з сабранага зварыла бацвінне. Беднае харчаванне і жыццёвыя бязладзіцы не вельмі засмучалі. Па-першае, лепшага не ведалі, так жылі ўсе. Па-другое, усеагульны аптымізм і энтузіязм навакольных перадаваўся дзецям, і дзеці адчувалі сябе пераможцамі і стваральнікамі. Не хапала ежы, адзення, абутку, вучнёўскіх сшыткаў. Дык нічога, куртку бабуля сшые са старога шыняля, кашулю з парашута, сшыткі з мамай зробім з унутраных слаёў цэментавага мяшка, а потым, калі разлінеім, будзем у іх пісаць, а ў школу можна і басанож прабегчы. Дзеці, як маглі, дапамагалі дарослым. Падобна сваім аднагодкам рабіў і Алег Чупрыгін: бульбу абярэ, печку падпаліць, вады прынясе, у пакоях прыбярэ, каля дома градкі дапаможа абрабіць.

Яго пакаленне з малых гадоў было прывучана да слова «трэба!». Словы «не хачу», «не буду» ў лексіконе падлеткаў тых часоў не дапускаліся. І гэта не таму, што забаранялася. Падлеткі бачылі паўсядзённае напружанне і тое, як стараліся дарослыя (нават інваліды) аднавіць разбуранае вайной, і самі імкнуліся дапамагчы, не патрабавалі лішняга.

Калі бацьку прызначылі дырэктарам школы, пераехалі ў в. Стрэшань Магілёўскай вобласці. Жыццё паступова наладжвалася: краіна адбудоўвалася, дзеці раслі. Смутак і разгубленасць прыйшлі з заўчаснай смерцю бацькі, чалавека, які не толькі прыносіў у сям'ю зарплату і нарыхтоўваў дровы для ацяплення дома, а быў галоўным стрыжнем сям'і, распарадчыкам, абаронцам і дарадцам для кожнага. Цяжкасці памнажаліся, хоць іх змякчалі маці, старэйшы брат, іншыя сваякі. У 1955 г. Алег Чупрыгін скончыў школу. Стаць матэматыкам ён марыў даўно. Хацелася быць такім дарослым і разумным, як бацька.

У студэнцкія гады Алег Чупрыгін асноўную ўвагу надае вучобе: лекцыі, практычныя заняткі, бібліятэка, аднак не забывае пра пашырэнне свайго кругагляду; наведвае лекторыі і тэатральныя пастаноўкі, удзельнічае ў студэнцкіх дыспутах, займаецца ў валейбольнай секцыі, выступае на спартыўных спаборніцтвах, прымае ўдзел у добраўпарадкаванні Мінска.

Алег Аляксандравіч Чупрыгін скончыў БДУ ў 1960 г. Як найлепшага студэнта яго рэкамендуюць для паступлення ў аспірантуру. Але калі прыйшоў час здаваць уступныя экзамены ў аспірантуру, ваенкамат выдаў павестку на прызыў у армію маладому лейтэнанту Чупрыгіну А. А., які прайшоў падрыхтоўку на ваеннай кафедры. Ён мог стаць прафесійным вайскоўцам. Яго добрасумленнасць і высокая адказнасць у выкананні даручанай справы, схільнасць уваходзіць у тонкасці любой працы і з любоўю яе выконваць у выпадку прызыву ў армію, несумненна, вызначылі б яму іншы жыццёвы шлях. Тым больш афіцэр – гэта ў першую чаргу выхавальнік, педагог. А Алег Аляксандравіч – педагог ад Бога, і ў Савецкай Арміі свой талент ён праявіў бы.



*Алег Аляксандравіч Чупрыгін*

Аднак Ганна Міхайлаўна, маці Алега Чупрыгіна, не бачыла імкненняў у свайго сына да вайсковай службы. З малых гадоў ён вырашаў галаваломкі, праседжваў дні і ночы над кнігамі – гульні ў «вайнушку» яго не захаплялі, а кімсьці падораны пісталет праз дзень стаў непатрэбным. Заклапочаная думкамі, як дапамагчы сыну, яна ўзгадала пра газетныя паведамленні, у якіх чытала пра свайго аднакурсніка па Аршанскім педагагічным вучылішчы, цяпер праслаўленага вайсковага камандзіра, двойчы Героя Савецкага Саюза Івана Ігнатавіча Якубоўскага. «Вось ён і зможа мне дапамагчы!» – радуючыся знойдзенаму рашэнню, яна ўзялася за пяро.

«Дзень добры, Янка! Ці памятаеш ты дзяўчынку, якая сядзела побач з табой за адной партай і з якой ты танчыў на студэнцкіх вечарынах? Ты вялікі чалавек, і табе зараз не да ўспамінаў, але... Я рада за цябе... Калі можаш, дапамажы майму сыну... »

Будучы маршал Савецкага Саюза Іван Ігнатавіч Якубоўскі ў той час быў генерал-палкоўнікам і галоўнакамандуючым групы савецкіх войскаў у Германіі, але ці то па няведанні, ці то па прадчуванні на канверце Ганна Міхайлаўна напісала: «Горад Масква, Крэмль, маршалу Якубоўскаму І. І.». І ліст дайшоў, хоць такога маршала ў той час не было, Міністэрства абароны не размяшчалася ў Крамлі, штаб камандуючага І. І. Якубоўскага знаходзіўся ў ГДР. Ліст не толькі дайшоў, але высокімі інстанцыямі па ім было прынята рашэнне. Задумваючыся, колькі людзей не фармальна паставілася да простага канверта са звышнедакладным адрасам, у наш час даводзіцца толькі дзівіцца. Алег Чупрыгін пра ліст даведаўся толькі ў кабінеце мінскага абласнога ваенкама, які азнаёміў яго з рашэннем пра трохгадовую адтэрміноўку (на час навучання ў аспірантуры) ад прызыву лейтэнанта запасу Чупрыгіна Алега Аляксандравіча. Гэта адкрыла яму шлях у аспірантуру.

З 1963 г. Алег Аляксандравіч працуе асістэнтам, а з 1968 г. дацэнтам кафедры вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі фізічнага факультэта БДУ. У 1966 г. А. А. Чупрыгін абараніў дысертацыю. З дапамогай электроннага пашуковіка лёгка знаходзіцца тэма: «Набліжэнне функцый алгебраічнымі інтэрпаляцыйнымі паліномамі па роўнаадлеглых вузлах. Кратнае трыганаметрычнае інтэрпаляванне з пропускамі вытворных». Распрацаваныя ў дысертацыйнай працы праблемы і зараз маюць важнае значэнне для матэматычнай апрацоўкі эксперыментальных вынікаў. А прасунутасць Алега Аляксандравіча ў гэтых пытаннях дазволілі яму выпрацаваць свой падыход у выкладанні матэматычных дысцыплін фізікам.

За час працы на фізічным факультэце Алег Аляксандравіч праявіў сябе як таленавіты навуковец, удумлівы педагог і ўмелы арганізатар. Свае шырокія веды, жыццёвы вопыт і прыродную мудрасць ён умее прыкласці ў паўсядзённых справах і звычайнай шараговай размове, таму заўсёды, пры любой, нават кароткай сустрэчы, адчуваеш прыемную цеплыню зносін, адчуваеш яго добразычлівасць, жаданне дапамагчы парадай, падтрымаць прыемным жартам, падзяліцца вопытам.

Большасць навін, уключаных у практыку работы фізічнага факультэта, былі ініцыяваны або ўпершыню апрабаваныя Алегам Аляксандравічам. Арганізацыя працы з патэнцыйнымі абітурыентамі, рэгулярны аналіз стану вучобы кожнага першакурсніка пасля двух месяцаў вучобы, бацькоўскі сход студэнтаў-першакурснікаў, студэнцкія спартакіяды, праца ў інтэрнаце і многае іншае. Алег Аляксандравіч умее правільна ацаніць вартасці іншых, яго падбор крытэрыяў адзнак бездакорны. Яго жыццёвая філасофія – рабіць карыснае для краіны і людзей, а любімыя заняткі – зносіны з прыродай, аўтамабіль.

Многія гады мы працавалі на адным факультэце, як кажуць, «плячо ў плячо»: ён намеснік дэкана па вучэбнай рабоце, а я намеснік дэкана па рабоце з замежнымі студэнтамі, потым – сакратар партбюро, усе гады нашы сталы стаялі побач у адным кабінеце. Калі я працаваў дэканам, кабінеты былі розныя, але з агульнай прыёмнай. Мы разам арганізоўвалі буйныя студэнцкія акцыі: суботнікі, будаўнічыя атрады, мастацтвазнаўчыя лекторыі, кросы, адбор таленавітых школьнікаў, канцэрты ў падшэфных калгасах і вайсковай часцы, вечары сустрэч з выпускнікамі факультэта, сустрэчы студэнтаў са знакамітымі людзьмі краіны, дапамогу калгасам на ўборцы бульбы. Мы разам вучыліся ва ўніверсітэце марксізму-ленінізму, выязджалі кіраўнікамі азнаямленчай вытворчай практыкі студэнтаў у Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы, разам бавілі вольны час.

Калі ў мяне не было машыны, Алег Аляксандравіч захопліваў на прыроду і маю сям'ю. У машыне, як вядома, пяць месцаў, а ў нашых дзвюх сем'ях налічвалася восем чалавек, дык ён рабіў па дзве паездкі раніцай і ўвечары. Трэба дадаць, што ініцыятыва паездкі, арганізацыя вогнішча заўсёды належалі Алегу Аляксандравічу. Гэта яшчэ адзін штрых да яго партрэта.

Высокія чалавечыя якасці навукоўца выяўляюцца ў адносінах на працы, у зносінах у сям'і, з сябрамі і проста з калегамі па навукова-педагагічным цэху. Мы паўсюль бачым яго высокую адказнасць, трапяткую прыстойнасць, таварыскую дабрыню, шчырую гатоўнасць дапамагчы, тактоўную шчырасць, адкрытасць. Ён можа даць параду, але не навязвае свайго меркавання. Ён заўсёды робіць сваю справу якасна і сумленна, нягледзячы на наяўнасць або адсутнасць кантролю. Калі яго запрасілі выкладаць у камерцыйную ВНУ, то, ледзь прапрацаваўшы адзін семестр, ён сышоў. Пры гэтым шчыра сказаў рэктару: «Тых, хто не жадае вучыцца, я навучыць не магу. І ставіць станоўчыя адзнакі студэнтам, якія нічога не ведаюць, не магу сябе прымусіць». Сумленнасць, натуральнасць і прастата характэрныя для Алега Аляксандравіча ў любой сітуацыі.

У яго выдатная сям'я. Жонка Людміла Трафімаўна, таксама матэматык, кандыдат навук, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, разумее мужа з паўслова, падтрымлівае Алега Аляксандравіча ў творчасці і любых пачынаннях. Мякка крытыкуючы членаў сям'і за дапушчаныя дробныя прамашкі, яна, як правіла, сваім заўвагам надае форму жарту.

Сын Аляксандр і дачка Ала даўно выраслі і маюць свае сем'і. Аляксандр Алегавіч – дырэктар СТАА «Драйвмотарс». У яго два сыны, Арсеній і Радзівон. Арсеній паспяхова заканчвае першы курс БДТУ. Радзівон пакуль гімназіст, але ўжо праяўляе многія таленты: круглы выдатнік, кавээшнік, мае поспех у вакале, захапляецца шахматамі.

Ала Алегаўна – матэматык-праграміст буйной фірмы. Дачка Алы Алегаўны Марыя Ігараўна – культуролаг, вучыцца ў аспірантуры.

Дзеці і ўнукі Алега Аляксандравіча, можна сказаць, адбыліся як асобы і ў прафесійным і ў грамадзянскім сэнсах. Вядома, іх станаўленне і поспехі карэкціраваліся і мякка накіроўваліся Алегам Аляксандравічам і Людмілай Трафімаўнай. Яны сваіх заслуг, праўда, не прызнаюць, хоць і ганарацца дзецьмі і ўнукамі. Дзеці, унукі і брат Горальд Аляксандравіч, які прапрацаваў настаўнікам фізікі больш за 50 гадоў, – дарадчыкі і добразычлівыя апаненты Алега Аляксандравіча, што прыносяць у дом радасць.

Сёння, як і раней, у слыннага матэматыка шырокія планы на будучыню. У яго шмат задум па абагульненні назіранняў і велічэзнага вопыту. Ёсць дакладнае разуменне, якімі павінны быць падручнікі і навучальныя дапаможнікі, як захапляць студэнтаў у цяжкай працы пазнання, як палегчыць пранікненне ў глыбіні навукі. Шмат і сумневаў, якімі хочацца падзяліцца, абмеркаваць і, магчыма, знайсці адказы.

Напрыканцы хачу пажадаць Алегу Аляксандравічу моцнага здароўя для далейшай рэалізацыі яго багатага жыццёвага і прафесійнага вопыту. Хай яго мудрасць і душэўная цеплыня і далей увасабляюцца ў новых творчых задумах, прыносяць поспехі і станоўчы водгук студэнтам, сям'і і блізкім людзям! З юбілеем Вас, дарагі Алег Аляксандравіч!

**Э. М. ШПІЛЕЎСКІ,**
**вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута цепла- і масаабмену імя А. В. Лыкава НАН Беларусі**

ПАДЗЕЯ

# НАЧНЫ СЕАНС СУВЯЗІ З МКС

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

### АД ФСС ДА НАНАСПАДАРОЖНІКА

БДУ ўжо каля 40 гадоў працуе ў касмічнай сферы. Адзначым, што на дадзены момант на МКС актыўна выкарыстоўваецца фотаспектральная сістэма (ФСС), распрацаваная НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі БДУ па кантракце з РКК «Энергія». Сістэма прызначана для правядзення вымярэнняў спектраў адлюстраванага выпраменьвання падсцілаючых паверхняў у дыяпазоне даўжынь хваль ад 350 да 1050 нм і фотавыяў у бачным дыяпазоне даўжынь хваль на расійскім сегменце МКС у касмічным эксперыменце «Ураган-МКС» (эксперыментальная адпрацоўка наземна-касмічнай сістэмы маніторынгу і прагнозу прыродных і тэхнагенных катастроф).

А цяпер з мэтай павышэння цікавасці маладога пакалення ў БДУ ідуць працы над стварэннем спадарожніка для студэнтаў.

«Мы хочам мець уласны спадарожнік, і для гэтага ўжо распрацаваны план-праект, які дзеліцца на тры этапы – стварэнне, выпрабаванне і сам запуск. Калі стварыць спадарожнік мы можам самастойна, то для яго выпрабавання і запуску неабходная падтрымка касмічных дзяржаў, якія маюць ракетаносьбіты, касмадромы і г. д. У Расіі працуе праграма па падтрымцы запускаў універсітэцкіх спадарожнікаў, Раскосмас робіць гэта бясплатна. Мы ўжо вядзём з імі перамовы, каб зразумець, будзем мы гэта рабіць сумесна з якім-небудзь універсітэтам або самастойна», – распавёў рэктар БДУ Сяргей Абламейка.



*Барыс Бяляеў і навуковы супрацоўнік лабараторыі оптыка-фізічных вымярэнняў Юрый Крот дэманструюць фотаспектральную сістэму для МКС*

Тэхнічныя нюансы беларускі бок ужо вырашыў. Але для ўвасаблення праекта ў рэальнасць неабходная дапамога ўсходніх суседзяў. Дамоўленасць на ўзроўні ВНУ ўжо дасягнутая.

«Запуск будзе бясплатным. Тыя элементы, якія будуць выраблены ў Расіі, можа, запатрабуюць некаторых укладанняў. Але мы ўсё ж такі будзем старацца, каб супрацоўніцтва паміж ВНУ будавалася на бязвыплатнай аснове», – запэўніў рэктар Паўднёва-Заходняга дзяржаўнага ўніверсітэта Сяргей Емяльянаў.

Нагадаем, што ў Беларускім дзяржаўным універсітэце ўжо распрацаваны праект уласнага спадарожніка з дакладнымі навуковымі задачамі. Засталося дачакацца традыцыйнай сярод касманаўтаў фразы: «Паехалі!»

**Алена ПАРФЁНАВА**

Фота Яўгена ПАМЫТКІНА

У ПРАФКАМЕ

# НОВАЕ Ў КАЛЕКТЫЎНАЙ ДАМОВЕ

**12 чэрвеня** на канферэнцыі працоўнага калектыву супрацоўнікаў БДУ была **заключана калектыўная дамова** на 2013–2016 гады.

Падрыхтоўка новай калектыўнай дамовы вялася ў рамках заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь, а таксама ў адпаведнасці з пагадненнем паміж Міністэрствам адукацыі РБ і Беларускім прафесійным саюзам супрацоўнікаў адукацыі і навукі на 2013–2016 гады. У прыватнасці, была створана камісія з ліку прадстаўнікоў адміністрацыі ўніверсітэта і прафкама. Яна неаднаразова збіралася на працягу некалькіх месяцаў, каб улічыць усе дапаўненні, прапанаваныя калектывам. Прарэктар па навучальна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях ***Уладзімір Сувораў*** расказаў нам, што ён не ўпершыню ўдзельнічае ў такіх перамовах і кожны раз з'яўляюцца новыя моманты, нюансы, якія варта абмеркаваць, каб потым унесці іх асобным пунктам у праект або знайсці іншыя фармулёўкі. На яго думку, тое, што калектыўная дамова заключаецца наноў кожныя тры гады, невыпадкова. Менавіта за гэты час становіцца відавочным, якіх змен патрабуе дадзены важны дакумент.

Па словах старшыні прафсаюзнага камітэта супрацоўнікаў БДУ ***Яўгена Туромшы***, калектыўная дамова, якая дагэтуль дзейнічала, прайшла сур'ёзную экспертызу на юрыдычным факультэце. Яна была значна перапрацавана і прыведзена ў адпаведнасць з іншымі заканадаўчымі дакументамі нашай краіны. А сёлета супрацоўнікі ўніверсітэта ўнеслі некаторыя прапановы па яе ўдасканаленні.

Сярод *новаўвядзенняў* калектыўнай дамовы на 2013–2016 гг. істотным з'яўляецца пункт, які даваляе пераводзіць тых, хто «прапрацаваў пяць гадоў на ўмовах кантрактнай формы найму без парушэнняў працоўнай дысцыпліны, па іх заяве на працоўную дамову, заключаную на нявызначаны тэрмін». Гэтага патрабуе калектыўная дамова галіновага прафсаюза. Аднак, па словах Яўгена Туромшы, не варта чакаць, што многія пойдуць на гэты крок не падумаўшы. Справа ў тым, што нязручнасці працы па кантрактнай форме кампенсуюцца ў нашым універсітэце пэўнымі перавагамі, напрыклад, падоўжаным тэрмінам адпачынку.

Адметна, што і зараз «па просьбе супрацоўніка ў тэрмін, які будзе ўзгоднены з кіраўніком структурнага падраздзялення, аднак не пазней за дзесяць дзён з дня падачы супрацоўнікам заявы, можна будзе датэрмінова скасаваць кантракт пры наяўнасці абставін, якія значна ўскладняюць працяг працы». Сярод іх – догляд за хворымі (інвалідамі) роднымі, а таксама «пераход мужа або жонкі на працу ў іншую мясцовасць, пераезд у іншую мясцовасць, накіраванне аднаго з іх на працу або для праходжання службы ў іншай мясцовасці, выбранне на выбарную пасаду, цяжарнасць жанчыны, працаўладкаванне ў іншага наймальніка на поўную стаўку, калі супрацоўнік працуе на няпоўную стаўку». «Змена сямейнага стану» – новая акалічнасць, якая бярэцца пад увагу.

Пры скарачэнні штату не дазваляецца звальненне адначасова двух супрацоўнікаў з адной сям'і, а таксама жанчын, якія выхоўваюць непаўналетніх дзяцей і не знаходзяцца ў шлюбе.

Істотна змяніўся параграф, які датычыцца аховы працы. Цяпер пры прыёме на працу «наймальнік абавязваецца даваць кожнаму супрацоўніку поўную і праўдзівую інфармацыю пра стан умоў і ахову працы на яго працоўным месцы, рызыкі пашкоджання здароўя, якія існуюць, пра сродкі індывідуальнай і калектыўнай абароны, а таксама льготы і кампенсацыі, вызначаныя заканадаўствам. Сям'і загінулага на вытворчасці супрацоўніка, акрамя вызначанай заканадаўствам кампенсацыі нанесенай шкоды, вырашана аказваць аднаразовую матэрыяльную дапамогу са сродкаў наймальніка ў памеры не меншым за 5 гадавых заробкаў загінулага, вылічаных па заробку за год ад месяца, які папярэднічаў няшчаснаму выпадку; супрацоўніку ж, які страціў прафесійную працаздольнасць у выніку няшчаснага выпадку на вытворчасці, аднаразовую матэрыяльную дапамогу ў памеры сярэднямесячнага заробку, аднак не больш за 24 сярэднямесячныя заробкі за кожны працэнт страты прафесійнай працаздольнасці пры наяўнасці ўласных сродкаў».

Не абышлі ўвагай і выплату прэмій супрацоўнікам у сувязі з іх узнагароджаннем. Іх памер вызначаецца палажэннем аб гэтых узнагародах. Аднак калі кіраўнік структурнага падраздзялення пачне хадайнічаць аб прэміі, памер якой значна большы, то той будзе вызначацца ўжо рэктарам або прарэктарам, які курыруе структурнае падраздзяленне. «Супрацоўніку, які ўзнагароджаны граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, будзе выплачвацца прэмія ў памеры трох базавых велічынь. А супрацоўніку, які ўзнагароджаны ганаровай граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, – у памеры пяці базавых велічынь».

Наогул, пытанні матэрыяльнага стымулявання ў БДУ заўсёды знаходзіліся пад пільнай увагай. Не пазбаўлена іх калектыўная дамова і на гэты раз. Лічыцца, што яна змяшчае найбольш ільгот і заахвочванняў да працы ў параўнанні з такімі ж дакументамі іншых вышэйшых навучальных устаноў. Уладзімір Сувораў, які выступаў падчас яе падпісання з боку наймальніка, тлумачыць гэта тым, што наша адміністрацыя імкнецца, каб супрацоўнікі ўніверсітэта цанілі сваю працу ў БДУ і былі проста шчаслівымі людзьмі. Яўген Туромша ў сваю чаргу падкрэсліў, што сацыяльная абароненасць кожнага члена калектыву залежыць ад сумесных намаганняў прафсаюзаў і адміністрацыі БДУ. Усе гэтыя намаганні нарэшце замацаваны ў калектыўнай дамове на 2013–2016 гг.

Для тых, хто дагэтуль не разумее ўсёй важнасці такога лакальнага нарматыўнага акта, варта патлумачыць, што калектыўная дамова мае абавязковую сілу для рэктарата як наймальніка і распаўсюджваецца на ўсіх супрацоўнікаў БДУ. Прафсаюз з яе дапамогай сёння можа абараніць правы і інтарэсы кожнага супрацоўніка ўніверсітэта ў сферы аплаты працы, прэміравання і матэрыяльнай дапамогі, занятасці, найму і звальнення, прафесійнай падрыхтоўкі і атэстацыі, рэжыму працоўнага часу і часу адпачынку, бяспекі працы і аховы здароўя, сацыяльна-бытавых і іншых праблем.

**Ганна ЛАГУН**

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# ІНАВАЦЫІ СУПРАЦЬ РАКУ

**Дамова аб доўгатэрміновым супрацоўніцтве** падпісана паміж БДУ, Расійскім анкалагічным навуковым цэнтрам імя М. М. Блахіна РАМН і Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтрам анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава.

Падпісанне адбылося падчас працы Беларуска-расійскай навукова-практычнай канферэнцыі з міжнародным удзелам «Айчынныя проціпухлінныя прэпараты». Візы паставілі рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка, дырэктар НДІ эксперыментальнай дыягностыкі і тэрапіі пухлін прафесар Анатоль Барышнікаў і намеснік дырэктара РНПЦ АМР імя М. М. Аляксандрава прафесар Сяргей Красны.

Мяркуецца развіццё сумесных навуковых даследаванняў у распрацоўцы, засваенні і стварэнні на аснове мадыфікаваных поліцукрыдаў пралангаваных нанасамальных лекавых формаў інтэрферону-α-2β і яго кампазіцый з цытастатыкаў у якасці сістэм адраснага ўздзеяння на злаякасныя пухліны. **Дарэчы, гэты праект пададзены ў расійскі інавацыйны фонд «Сколкава».**

Акрамя таго, па выніках Беларуска-расійскай навукова-практычнай канферэнцыі «Айчынныя проціпухлінныя прэпараты» прынятая рэзалюцыя аб інтэграцыі ведаў расійскіх і беларускіх навукоўцаў і практыкаў у галіне вытворчасці і ўкаранення новых лекавых проціпухлінных сродкаў. І што асабліва важна, вызначаны шляхі далейшага ўзаемадзеяння паміж навуковымі, медыцынскімі і фармацэўтычнымі арганізацыямі ў галіне клінічных выпрабаванняў проціпухлінных прэпаратаў.

Нагадаем, Беларуска-расійская навукова-практычная канферэнцыя з міжнародным удзелам «Айчынныя проціпухлінныя прэпараты» завяршылася 25 мая ў БДУ. Яе ўдзельнікамі сталі 386 навукоўцаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Казахстана, Літвы і Даніі.

АБ'ЯВЫ


**«ІНСТЫТУТ ЯДЗЕРНЫХ ПРАБЛЕМ» БДУ**

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАДЫ**

НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА лабараторыі ядзернай оптыкі і касмамікрафізікі.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 11, аддзел кадраў, пакой 315, тэл. 226 42 31.*


# БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Прамы сеанс радыёсувязі БДУ і МКС** – Інтэрфакс, БелТА, sb.by, uvaga.by, novostimira.com, novoteka.ru, «Ежедневник» (04.06); АНТ, СТБ, tut.by, ng.by, 21.by, 5min.by, kp.by, news-n-facts.ru, techlabs.by, uenews.ru, ng.by, onliner.by, naviny.by, БелаПАН (05.06); «Рэспубліка», respublika.info, Беларуская ніва, «СБ – Беларусь сегодня», sb.by, «Настаўніцкая газета» (06.06).

**Гутарка з рэктарам БДУ Сяргеем Абламейкам пра сёлетнюю прыёмную кампанію** – СТБ (02.06); ex-press.by, 21.by, onliner.by (03.06).

**Пра адкрыццё новай спецыяльнасці ў магістратуры ІБМТ БДУ «Тэхналогія кіравання персаналам»** – БелТА, 21.by (03.06).

**Анлайн-канферэнцыя з рэктарам БДУ Сяргеем Абламейкам** – БТ-1 (30.05).

**Па матэрыялах міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Сям'я ў кантэксце дэмаграфічных і гендарных праблем сучаснага грамадства»** – mail.ru (30.05); БелТА, БелаПАН, 21.by, open.by, tut.by (31.05).

**Гутарка з пераможніцай Еўрапейскай матэматычнай алімпіяды сярод дзяўчат ліцэісткай БДУ Лізаветай Даўгяла** – «Звязда», zvyazda.minsk.by (30.05).

**Адкрыццё новых спецыяльнасцяў у БДУ** – «Знамя юности» (24.05), zn.by (28.05); 21.by, bdg.by (27.05); naviny.by (28.05); «Минский курьер», mk.by (29.05); «Рэспубліка» (30.05).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

СТУДЭНЦКІ ІНТАРЭС

# Where are you going? – Па замежны вопыт!

Не сакрэт, што сёння пры выбары ВНУ для атрымання вышэйшай адукацыі абітурыенты асаблівую ўвагу надаюць магчымасці ўдзелу ў міжнародных праграмах і праектах. Як паказваюць апошнія сацапытанні, менавіта **наяўнасць шырокага спектра міжнародных праграм акадэмічнай мабільнасці** выгадна вылучае БДУ сярод іншых ВНУ Беларусі.



Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

*Студэнты БДУ збіраюцца на стажыроўку ў Еўропу па праграме Erasmus Mundus*

І гэта сапраўды так! Сёння ў нашай ВНУ створаны ўсе ўмовы для развіцця міжнародных акадэмічных абменаў і рэалізацыі міжнародных праектаў. Больш за 500 студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў БДУ штогод праходзяць навучанне і стажыроўкі ў вядучых еўрапейскіх ВНУ – Енскім, Бохумскім, Лейпцыгскім універсітэтах у Германіі, Варшаўскім, Вроцлаўскім і Кракаўскім універсітэтах у Польшчы, Карлавым універсітэце і Універсітэце імя Т. Масарыка ў Чэхіі; у краінах Балтыі – у Вільнюскім і Латвійскім універсітэтах, у Францыі – ва ўніверсітэтах Тулузы і Савоі, у Італіі – ва ўніверсітэтах Падуі, Трэнта і Перуджы, у Іспаніі – ва ўніверсітэтах Барселоны, Гранады і Сарагосы. Акадэмічныя абмены таксама рэалізуюцца з ВНУ Кітая, В'етнама, Японіі, Расіі, Украіны, Турцыі, Егіпта і іншых краін.

Разам з супрацоўніцтвам паміж ВНУ ў БДУ дзейнічаюць міжнародныя праграмы, у рамках якіх студэнты маюць магчымасць навучацца на працягу 1–2 семестраў за мяжой, прымаць удзел у летніх школах, семінарах, праходзіць навуковыя стажыроўкі і вытворчую практыку. Можна вылучыць праграмы Германскай службы акадэмічных абменаў DAAD, праграму Шведскага інстытута Visby, праграму Фінскага цэнтра міжнароднай мабільнасці CIMO, стыпендыяльныя праграмы Вышаградскага фонду, праграму абмену студэнтаў тэхнічных спецыяльнасцяў IAESTE, праграму Сеткавага ўніверсітэта СНД, а таксама многія іншыя. Адпаведная інфармацыя размешчана на сайце БДУ ў рубрыцы *«Праграмы навучання за мяжой»*.

Найбольш папулярнай у нашых студэнтаў праграмай акадэмічнай мабільнасці з'яўляецца праграма **Erasmus Mundus**, якая фінансуецца Еўрапейскім саюзам. Яе перавага ў тым, што яна пакрывае цалкам усе расходы па праездзе і знаходжанні ў замежнай ВНУ. Штогод больш за 150 студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў БДУ прымаюць удзел у конкурсах грантаў праграмы Erasmus Mundus. Яна дае магчымасць праходзіць навучанне ў 27 еўрапейскіх ВНУ.

Не выключэннем стала і нядаўняя конкурсная кампанія, якая прайшла ў БДУ з кастрычніка 2012 г. па сакавік 2013 г. Пры агульным конкурсе ў 6 чалавек на месца навучэнцы і супрацоўнікі БДУ дасягнулі выдатных вынікаў: нашы канкурсанты атрымалі найбольшую колькасць грантаў у параўнанні з удзельнікамі з іншых краін СНД. У выніку ***45 стыпендыятаў*** з ліку навучэнцаў альбо супрацоўнікаў БДУ займелі магчымасць прайсці навучанне ў еўрапейскіх ВНУ з верасня 2013 г. Большасць грантаў (каля 60 %) атрымалі прадстаўнікі ФМА, на другім месцы гістарычны і эканамічны факультэты.

Па статыстыцы, першае месца па колькасці запрошаных стыпендыятаў з БДУ займае адзін з вядучых ВНУ Фінляндыі – Універсітэт Турку. Затым ідуць Балонскі і Вільнюскі ўніверсітэты. Навучэнцы і супрацоўнікі БДУ ў рамках гэтай праграмы таксама паедуць на навучанне ў Германію, Італію, Іспанію, Польшчу, Партугалію, Францыю і Швецыю.

Аднак выйграць грант на навучанне яшчэ палова справы. Немалаважна загадзя падрыхтавацца да паездкі, правільна аформіць неабходныя дакументы, атрымаць навучальныя візы замежнай дзяржавы, нарэшце, проста падрыхтавацца маральна.

Каб падтрымаць стыпендыятаў, а таксама дапамагчы ім своечасова і беспераШкодна прайсці ўсе неабходныя працэдуры да ад'езду за мяжу, упраўленне міжнародных сувязяў правяло арганізацыйны сход пераможцаў конкурсаў праграмы Erasmus Mundus. Перад стыпендыятамі выступіў рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка, які заклікаў студэнтаў годна прадстаўляць наш універсітэт і краіну за мяжой і як мага больш эфектыўна выкарыстоўваць магчымасці для атрымання дадатковых ведаў і ўмацавання сваіх прафесійных навыкаў, наладжвання кантактаў са сваімі аднагодкамі за мяжой, пашырэння далягляду і, нарэшце, удасканалення валодання замежнай мовай.

Поспехі студэнтаў БДУ на конкурсах міжнародных праграм сведчаць пра высокую якасць навучання ў нашым універсітэце і значны патэнцыял акадэмічнай супольнасці, якая ў ім склалася.

**Аляксандр РЫТАЎ,**
**начальнік аддзела УМС**

КАНТАКТЫ

# ААН пра барацьбу з наркотыкамі

29 мая БДУ наведаў намеснік генеральнага сакратара ААН выканаўчы дырэктар Упраўлення па наркотыках і злачыннасці ААН **Юрый Фядотаў.**

Высокі госць правёў перамовы з рэктарам акадэмікам Сяргеем Абламейкам, падчас якіх былі абмеркаваны магчымыя праекты міжнароднага супрацоўніцтва з удзелам БДУ. Затым вядомы дыпламат пазнаёміўся з працай факультэта міжнародных адносін і выступіў перад студэнтамі і супрацоўнікамі. Ва ўступнай прамове дэкан факультэта міжнародных адносін Віктар Шадурскі закрануў пытанні супрацоўніцтва ФМА з МДІМА (У), выпускніком якога з'яўляецца Юрый Фядотаў.

У сваім выступленні Юрый Віктаравіч падрабязна спыніўся на прынцыпах і прыярытэтах дзейнасці ААН, арганізацыі працы Упраўлення па наркотыках і злачыннасці. Ён акрэсліў кола праблем, з якімі прыходзіцца сутыкацца ў рамках працы ўпраўлення, якое ён узначальвае, адзначыў важнасць прэвентыўных захадаў для іх вырашэння.

Кіраўнік ААН прывёў прыклады канкрэтных праграм, якія ініцыяваныя і ажыццяўляюцца Упраўленнем па наркотыках і злачыннасці. Сярод іх праграма па барацьбе з пірацтвам ля берагоў Самалі, стварэнне фонду для дапамогі пацярпелым ад гандлю людзьмі, акцыі, накіраваныя на змяншэнне попыту на наркотыкі ў краінах, якія развіваюцца.

Затым у студэнтаў была магчымасць задаць Ю. В. Фядотаву пытанні, якія іх цікавяць. Так, студэнты спыталі пра развіццё сітуацыі з наркагандлем у Афганістане пасля вываду кааліцыйных войскаў, пра афіцыйную пазіцыю ААН па апошніх падзеях у Сірыі, меркаванне спадара Фядотава наконт узроўню злачыннасці і эфектыўнасці барацьбы з ёй у Беларусі.

Юрый Віктаравіч адказаў на кожнае пытанне і пасля заканчэння сустрэчы пакінуў запіс у кнізе ганаровых гасцей факультэта.

**Аляксандра ШКОЛА**

ФОТАФАКТ



*Каманда прафсаюза адукацыі і навукі г. Мінска, у складзе якой выступалі 10 чалавек з БДУ (у тым ліку дырэктар РЦАП па футболе БДУ Уладзімір Пігулеўскі і прарэктар Уладзімір Панарадаў), стала пераможцай адкрытага рэспубліканскага турніру па футболе сярод ветэранаў (ад 40 гадоў) на прызы Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. У фінале бралі ўдзел найлепшыя ветэранскія каманды абласцей і горада Мінска. У вырашальным матчы «сталічнікі» перамаглі каманду БелАЗа з лікам 3:1.*

ІНІЦЫЯТЫВЫ

# Тэлемост Мінск – Масква

Кафедра англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў (загадчык – прафесар С. А. Дубінко) зладзіла тэлемост паміж ФМА БДУ і Маскоўскім дзяржаўным інстытутам міжнародных адносін (РФ), прысвечаны тэме: **«Doing business: national business climate in different countries».**

Студэнты 4 курса спецыяльнасці «Міжнародныя эканамічныя адносіны» далі агульную характарыстыку інвестыцыйнаму клімату ў нашай краіне, пазначылі нацыянальныя асаблівасці вядзення бізнесу, а таксама вылучылі найбольш перспектыўныя кірункі развіцця бізнесу.

Расійскі бок, прадстаўлены магістрантамі розных эканамічных спецыяльнасцяў, у тым ліку і МЭА, цікавілі пытанні ўдзелу Рэспублікі Беларусь у Мытным саюзе Расіі, Беларусі і Казахстана, а таксама абароны правоў і інтарэсаў замежных інвестараў на тэрыторыі Беларусі.

Пытанні студэнтаў ФМА БДУ тычыліся ўдзелу Расіі ў Сусветнай гандлёвай арганізацыі, змены старшыні Банка Расіі, а таксама пераваг інвестыцыйнага клімату, якія спрыяюць прыцягненню ў краіну новых інвестараў.

Пасля першай часткі відэаканферэнцыі слова было перададзена міжнародным камандам універсітэтаў: Германіі і Кітаю.

Абмеркаванне праходзіла ў творчай атмасферы, якая спрыяла актыўнаму абмену думкамі. Неабходна адзначыць высокі ўзровень падрыхтоўкі і правядзення тэлемаста, актуальнасць пытанняў, якія ўздымаліся, зацікаўленасць каманд у навуковай дыскусіі.

Спадзяёмся на далейшае супрацоўніцтва з расійскімі калегамі.

**Марыя КАСАЛАПАВА**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

13 чэрвеня 2013 года
Падпісана да друку 11.06.2013 г.
Зак. . Тыраж 1500 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/0494178 ад 03.04.2009.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

**Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ**
Карэктар Ганна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
***e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by***